Источник: "Краязнаўчая газета" - 2013-03-14

# На тым тыдні...

✓ **4 сакавіка** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адбылася **прэзентацыя ўнікальнага двухбаковага вынаснога абраза (ферагрона) XVIII ст.** з фондаў музея.

Ферагрон – у каталіцкіх і ўніяцкіх храмах вынасны абраз або скульптура, якія выкарыстоўваліся пад час працэсіяў. У фонды Нацыянальнага гістарычнага музея ферагрон патрапіў у 1971 г. у выніку экспедыцыі. Аднак з-за дрэннага стану ніколі не экспанаваўся. У 2012 г. дзякуючы калектыву рэстаўратараў ААТ «Белрэстаўрацыя» на чале з У. Нікіціным гэты ферагрон атрымаў другое жыццё.

✓ **5 сакавіка** Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа зладзіў святочную музычную імпрэзу. Ва ўтульнай гасцёўні прайшоў традыцыйны **«Кватэрнік у дзядзькі Якуба»**. Гэтым разам у камернай атмасферы заграў гурт «Нельга забыць», які прадставіў увазе прысутных праграму «Леаніды не вернуцца да зямлі...» паводле аднайменнага твора Уладзіміра Караткевіча.

✓ **5 сакавіка** ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва прэзентавалі новы фатаграфічны праект Андрэя Шчукіна **«Кінестетика»**.

✓ **6 сакавіка** ў філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь «Дом-музей I з'езда РСДРП» адбылася **прэзентацыя асабістых рэчаў і фотаздымкаў Ларысы Александроўскай**, першай у рэспубліцы народнай артысткі СССР (1940), першай жанчыны-рэжысёра оперы. Прэзентацыя праходзіла ў рамках доўгатэрміновага выставачнага праекта «Первые».

✓ **6 сакавіка** ў мінскай галерэі «Ласандр-арт» адкрылі выстаўку жывапісу мастака і архітэктара Івана Мядзведзева **«Паэзія белых начэй»**, прысвечаную 100-гадоваму юбілею творцы. На ёй прадстаўленыя акварэлі 1945–1953 гг. з відамі Ленінграда, Вільні, Рыгі з прыватнай калекцыі дачкі мастака Ірыны Кузняцовай.

Выстаўка працягнецца да 30 сакавіка.

✓ **6 сакавіка** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылося **адкрыццё гістарычнай выстаўкі «Сакавік 1968»**. Яна прысвечаная падзеям сакавіка 1968 года – аднаму з найважнейшых перыядаў у гісторыі Польшчы пасля Другой сусветнай вайны. У экспазіцыі прадстаўленыя фатаграфіі і дакументы, што адлюстроўваюць разгортванне сакавіцкіх падзеяў у розных гарадах Польшчы: надзвычайны сход Варшаўскага аддзела Саюза польскіх пісьменнікаў, студэнцкія мітынгі, вулічныя маніфестацыі, масавыя сходы ў прафсаюзах і інш.

Праект падрыхтаваны пры падтрымцы Інстытута Нацыянальнай Памяці (Варшава) і Польскага Інстытута ў Мінску.

"Краязнаўчая газета". На тым тыдні…